лорных творах. Але яно не застылае. З цягам часу жанравае мысленне змяняецца, таму што рухаецца сама фальклорная свядомасць, хоць і робіць гэта значна павольней за развіццё агульнай сістэмы ўяўленняў калектыву.

ЛІТАРАТУРА:


1. Андреев А.Н. Методология литературоведения.– Мн., 2000.

2. Андреев А.Н. Целостный анализ литературного произведения.– Мн., 1995.

3. Лурия А.Д. Об историческом развитии познавательных процессов. Эксперементально-психологическое исследование.– М., 1974.

4. Путилов Б.Н. Методология сравнительно-исторического изучения фольклора.– Л., 1976.

5. Путилов Б.Н. Фольклор и народная культура.– СПб., 1994.

6. Раевский Д.С. Модель мира скифской культуры.– М., 1985.

7. Современный философский словарь / Под ред. В.Е. Кемерова.– М., Бишкек, Екатеринбург, 1996.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Ляховіч Л.У.*

## ПСІХАЛАГІЧНЫ ФЕНОМЕН "ПРЫЗНАННЯ ТВОРЦЫ" Ў КАНТЭКСЦЕ РЭЛІГІІ І КУЛЬТУРЫ

Ролю культуры і рэлігіі ў духоўнай сферы чалавека немагчыма перабольшыць. Больш таго, рэлігійныя і культурныя крытэрыі з'яўляюцца вызначальнымі для характарыстыкі і тыпалогіі цывілізацый.

Таму зусім не выпадкова, што пры даследаванні структуры чалавецтва апошняга тысячагоддзя англійскі гісторык А.Тойнбі вылучыў пяць тыпаў цывілізацый: заходняе грамадства, аб'яднанае хрысціянствам; праваслаўна-хрысціянскае (візантыйскае); ісламскае; індуісцкае; грамадства Далёкага Усходу.

Рэлігія ў значнай ступені фарміруе менталітэт, светаўспрыняцце, этычныя нормы, лад жыцця. Мастацкая культура ў сваім першапачатковым варыянце мела рэлігійную аснову (варта ўспомніць магічныя арнаменты, міфалогію, культавую скульптуру, эпас і г.д.). Можна сцвярджаць, што кожны так званы цывілізаваны чалавек з'яўляецца нашчадкам і носьбітам назапашаных у яго асяроддзі рэлігійных традыцый (асабліва ў сферы маралі), нават калі яны не выражаюцца ў яскравай форме. Рэлігійны фактар прысутнічае ў грамадстве заўсёды, незалежна ад эпохі, адносін царквы і дзяржавы, узроўня адукацыі, ступені

рэлігійнасці выхавання і г.д. Вопыт XX стагоддзя і сёняшняга дня пацвярджае гэта. Рэлігійныя ўсведамленні і пачуцці – адносяцца да найбольш кансерватыўных і далікатных у чалавечай псіхіцы. Гэта моцныя глыбінныя ўяўленні, якія ў мінімальнай ступені трансфармуюцца, часцей за ўсё негатыўна рэагуюць на знешняе ўздзеянне, а тым больш на дэфармацыю. Таму невыпадкова рэлігійныя спрэчкі і адрозненні такія жывучыя, войны на рэлігійнай глебе асабліва фанатычныя, а для чалавека пераход з адной рэлігійнай сістэму ў другую з'яўляецца сур'езным духоўным пераломам.

Чаму так адбываецца?Аб ролі і паходжанні рэлігіі спрэчкі вядуцца ўжо не адно стагоддзе. Ясна адно: рэлігія спрабуе даць адказы на "вечныя пытанні" – аб сэнсе жыцця, смерці, душы, смяротнасці або бессмяротнасці, месцы чалавека ў сусвеце, дабры і зле, вечнасці і імгненні... Пры гэтым ад чалавека не патрабуецца спецыяльнай інтэлектуальнай падрыхтоўкі, дастаткова толькі верыць.

З навуковых пазіцый можна ў пэўным сэнсе пагадзіцца з меркаваннем французскага асветніка П. Гольбаха аб рэальных чалавечых патрэбах у рэлігійных пачуццях. Узнікненне рэлігіі, паводле Гольбаха, абумоўлена імкненнем чалавека да самазахавання, жадання пазбавіцца ад гора, страхам перад сіламі прыроды, незадаволенасцю ўмовамі жыцця і г.д. Але гэта спрошчаны падыход (дарэчы, перадавы для эпохі Асветы з яе рацыяналізмам). Акрамя страху, незадаволенасці і іншых негатыўных пачуццяў чалавек імкнуўся пазнаць сутнасць усяго існага, усведаміць сваё месца ў свеце, накірунак развіцця сусвету і зазірнуць у будучыню. Але чаму "імкнуўся" і "жадаў"? Чалавек, як і тысячы гадоў таму, пазнае свет, ставіць перад сабой спрадвечныя пытанні, жадае пашырыць свае веды і магчымасці. Сама прырода з яе рацыянальнай пабудовай, гармоніяй, запасам трываласці выклікала і выклікае думку аб Творцы, вышэйшым разуме, імпульсе, які даў усяму гэтаму жыццё. Таму рэлігія была і будзе, як і яе даўні антыпод – атэізм.

Больш таго, не толькі прырода, але і ўвесь вопыт свядомага існавання спараджалі і спараджаюць думкі аб Творцы, першапачатку (прычым незалежна ад стану навукі і паралельна з ёй шукаючы адказы на пытанні і фарміруючы новыя).

Вось як аб гэтым выказаўся вядомы псіхолаг П.Таранаў: "Я мяркаваў, што рэлігія, вераванне ёсць спецыфічны прадукт чалавечага мозга, дзейнасць якога, нармальная ад прыроды, так іманентна прэпарыруе і ператварае наяўнае ў ім... што ў выніку заўсёды рэалізуецца ўяўленне аб Вярхоўнай істоце або Першапачатку. Паняцце Бога не прыроджана нам, яго няма ў мазгу, які развіваецца, але пры запаўненні мозга на-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ступствамі жыццёвага вопыту, адбіткамі органаў пачуццяў яно "прарастае" іх, падобна таму, як з насення ружы пры яе росце "прарастае" яе пах, якога не было ні ў зямлі, ні ў каранях, ні ў лісци... Можа быць, запаўненне душы паняццем Бога ёсць адзін з найбольш важных прызнакаў самазахавання ўсяго жывога".

Дадзены феномен прысутнічаў заўсёды ва ўсіх народах, нават з аднолькавымі рысамі (што таксама ставіць шмат цікавых пытанняў). Аб гэтым яскрава распавядае міфалагічны эпас розных краін. Звярнемся хаця б да некаторых.

Старажытныя егіпцяне так паведамляюць у "Тэкстах пірамід" аб стварэнні свету: "Не было яшчэ ні неба, ні зямлі... Прасціраўся неаглядны Нут – праакіян". У іншай крыніцы гэта выглядае наступным чынам: "Спачатку былі Хаос і Бездань, Бязмежны і Бязмежнае, Змрок і Цьма, Паветра і Бура – чатыры шлюбныя пары, восем боскіх стыхій. Яны стварылі Свет і першастворaную Цвердзь, на якой з'явіўся першы з гарадоў, Хнум".

А вось як распавядаюць шумеры: "Калісьці нябесы і зямля былі злітыя, і не было на іх ні травы, ні трыснягу, ні дрэў, ні звяроў, ні людзей. Былі яны як адна гара ў прасторы, запоўненая водамі дачкі акіяна Намму, прамаці ўсяго існага. І стварыла яна з сябе Ана – Неба і Кі – Зямлю, сына і дачку, і пасяліла іх асобна".

Старажытныя індыйцы таксама захавалі ўспаміны аб бязмежным Акіяне і Цемры: "Упачатку не было ні існага, ні неіснага. Не было ні паветранай прасторы, ні неба над ёй. Не было ні смерці, ні бессмяротнасці. Не было ні дня, ні ночы. Але было штосьці, што дыхала, не рухаючы паветра. І не было нічога, акрамя яго. Свет быў схаваны Змрокам.

У Кнізе Быцця, Першай кнізе Бібліі, сказана: "Земля же была безвидна и пуста, и тьма над бездною, и дух Божий носился над водою". Падобныя прыклады можна працягваць і далей. Аб пачатку свету і жыцця на ім старажытнагрэчаскі філосаф Платон распраўядаў так: "Калісьці наша прырода не была такой, як зараз. Цела ва ўсіх было акруглае, спіна не адрознівалася ад грудзей, рук было чатыры, ног столькі ж, і ў кожнага на круглай шыі два твары, зусім аднолькавыя..." Багі, бачучы гэтых бясполых монстраў, разрэзалі іх напалам, стварыўшы першых мужчын і жанчын, прародзічаў чалавецтва. Раздзяленне прайшло паспяхова, аднак застаўся смутак па былым адзінстве. "Так, кожны з нас, — піша Платон, — гэта палавіна чалавека, рассечанага на дзве часткі, і таму кожны шукае палову, якая яму адпавядае".

Старажытнаіндыйскія Веды захавалі памяць аб першаістоце Півасваці, якога рассеклі багі. Так стварыўся першы мужчына, які ўзяў сабе ў жонкі першую жанчыну.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Падзел адзінага свету прывёў да дваістасці ўсяго існага. Узніклі неба і зямля, агонь і вада, чорнае і белае, гармонія і хаос, мужчынскі і жаночы пачатак.

Паводле старажытнагрэчаскага паэта Гесіёда, услед за Хаосам нарадзілася Гея – Зямля. Была яна адна, не было ў яе мужа. Таму Гея, Зямля, першамаці ўсяго існага, падзялілася на уласна зямлю і неба – Уран.

Старажытныя рымляне называлі Прамаці-Зямлю імем Целлус. Некалькі разоў у год ёй прыносілі ахвяры сцельнымі каровамі. Па старажытным звычаі, першую шлюбную ноч маладыя праводзілі на свежаўзараным полі. Памерлых рымляне аддавалі Прамаці і прасілі яе быць літасцівымі да іх.

Манголы шанавалі Этуген – Маці-зямлю, разлучаную са сваім мужам Ценгры. Яна была аб'ектам шаманскага культу, усемагутным бажаством прыроды, якое нарадзіла ўсё існае.

У тыя ж часы нарадзіўся і славянскі бог неба, бацька сонца і агню, Сварог. Ён падняўся над Маці Сырой Зямлёй у сінія высі. Праліваўся ён на зямлю жывым дажджом, гледзячы на Маці-Зямлю вачамі-зоркамі. Дзецям Сварога і Маці Сырой Зямлі ў зямным жыцці была бліжэй маці, а з бацькам яны сустракаліся ў жыцці нябесным.

Культ Прамаці-зямлі вядомы амаль усім народам і з'яўляецца відавочным пацверджаннем універсальнасці ідэі "прызнання Творцы" (праўда, у некалькі апасродкавальным выглядзе).

Феномен "прызнання Творцы" з'яўляецца краевугольным у міфалагічных і рэлігійных уяўленнях, ён з'яўляецца універсальным у кантэксце цывілізацыйнага развіцця, даючы аснову для шматлікіх праяў духоўнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Майсеня С. И.*

## ПРИМЕНЕНИЕ СОВРЕМЕННЫХ ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫХ ТЕХНОЛОГИЙ ПРИ ПОДГОТОВКЕ МЕНЕДЖЕРОВ В СФЕРЕ КУЛЬТУРЫ

Одна из проблем, возникших в конце 20 века в процессе образования и требующее новых подходов и изменений, – огромное количество накопленных человечеством знаний. Именно поэтому те подходы в образовательном процессе, которые использовались ранее, более не могут отвечать требованию современного общества. Если ранее обуче-